*А. И. Ашомка*

## ЦЕННОСТНЫЕ ОРИЕНТАЦИИ СОВРЕМЕННОГО СПОРТСМЕНА

*На основе анализа научной литературы и результатов социологических исследований рассмотрено влияние социальной дифференциации на формирование ценностных ориентаций в сфере физической культуры в современном обществе.*

*В формировании ценностных ориентаций в области физической культуры определяющим является процесс физического воспитания ребенка родителями.*

Факторами, определяющими отношение индивида к физической культуре, с одной стороны, и являющимися непосредственным отражением определенной социально-демографической группы, с другой стороны, могут быть уровень материального достатка, вид трудовой деятельности, уровень общекультурного и интеллектуального развития, место проживания, возраст, пол, ценностные ориентации данной социально-демографической группы и так далее.

Целью работы является рассмотрение влияния социальной дифференциации на формирование ценностных ориентаций в области физической культуры.

Продолжая тему зависимости формирования ценностных ориентаций в области физической культуры и спорта у детей от принадлежности их родителей к той или иной социально-демографической группе, хочется отметить, что спорт необходимо рассматривать как явление, включающее в себя элемент социального расслоения (стратификации), и в то же время как инструмент социализации в соответствии с определенным набором характеристик социального статуса человека.

Было установлено, что спорт входит в число переменных, которые характеризуют устойчивую структуру скрытого социального расслоения и в наибольшей степени влияют на процессы социальной дифференциации. Даже если явление профессионального статуса и социально-политического статуса родителей, профессиональных и бытовых характеристик самого индивида невелико, важен сам факт, что данный человек занимается спортом.

Также можно констатировать тот факт, что унаследованный индивидом статус играет в выборе вида спорта большую роль, чем статус приобретенный. Профессиональный и социально-политический статус родителей являются такими характеристиками скрытого социального расслоения, которые в наибольшей степени определяют выбор человеком вида спорта.

Результаты исследований по данной тематике позволяют сделать следующие выводы:

1. Наличием в обществе различных социальных слоев обусловлены различные возможности человека для занятия спортом.

2. В ходе исследования была выявлена тенденция к определенной концентрации молодых людей, принадлежащих к одному социальному слою.

Таким образом, спорт выступает как важное средство социализации в рамках данной общественной группы, а также в качестве устойчивого признака социального расслоения, ведущего к усилению дифференциации общественных групп.

### Литература

1. Осипов, Г. В. Социология. Основы общей теории / Г. В. Осипов. – М.: Норма, 2003 – 912 с.

2. Пряжников, Н. С. Профессиональное самоопределение. Теория и практика / Н. С. Пряжников. – М.: «Академия», 2008. – 320 с.

**УДК 821.161.3-3***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*К. М. Бандурына*

# КУЛЬТУРНАЯ ТРАЎМА ПОСТСАВЕЦКАГА ЧАСУ (ПАВОДЛЕ КНІГІ С. АЛЕКСІЕВІЧ «ЧАС СЭКАНД-ХЭНД»)

*Кніга Святланы Алексіевіч «Час сэканд-хэнд»стала адной з самых яркіх падзей літаратурнага жыцця краіны апошніх гадоў. Жанр, у якім піша свае творы пісьменніца, дазваляе закрануць глыбінныя пытанні чалавечага існавання, не звяртаючыся пры гэтым да прыёмаў стварэння альтэрнатыўнай рэальнасці. Рамкі нон-фікшн абмежаваныя дакладнасцю фактаў, аўтар не мае права на выдумку. Нягледзячы на такое абмежаванне, нявыдуманая літаратура карыстаецца ўсё большай папулярнасцю дзякуючы менавіта тым праблемам, якія яна можа ўзняць на падставе звароту да рэальных падзей. Гэта адвечныя пытанні дабра і зла, жыцця і смерці, сэнсу існавання чалавека, яго маральнага выбару, псіхалагічныя і культурныя траўмы. Пошукі адказаў на гэтыя пытанні і ажыццяўляе Святлана Алексіевіч у сваёй кнізе.*

Працуючы ў жанры дакументальнай прозы, вельмі цяжка застацца па-за кадрам і не дадаць сваіх уражанняў, сваіх думак, абстрагавацца ад аўтарскага «Я». Уздымаючы праблемы, якія закранулі не адно пакаленне людзей на ўсёй постсавецкай прасторы і якія тычаць асабіста цябе, застацца аб'ектыўным сузіральнікам амаль што немагчыма. Для таго, каб пазбегнуць суб'ектыўнасці ў выкладанні фактаў, Святлана Алексіевіч выкарыстоўвае прыём мантажу: розныя погляды і меркаванні, гісторыі розных людзей яна складае ў агульную карціну, за якой чытаецца водгук аўтара на праблему, але гэты водгук пераклікаецца з гісторыямі саміх герояў. Ён аб'ектыўны па сваёй сутнасці. У артыкуле «Дакумент павінен жыць па законах мастацтва»расійскі даследчык В. Крылоў піша: «Усе ролі, у якіх знаходзіцца Алексіевіч як рэальная прыватная асоба ў размовах са сваімі героямі (пісьменнік, журналіст, акцёр, сацыёлаг, псіхааналітык), быццам адсякаюцца, і аўтар (апавядальнік) выступае ўжо толькі як «сусед па часе»(згодна трыфанаўскага выразу). Аўтар максімальна хавае сваю прысутнасць у кнізе, ён адзін з многіх, «саўдзельнік»…» [1, с. 251].

Кніга закранае самыя розныя пытанні: існавання чалавека ў грамадстве, несвабоды асобы, адданасці ідэалам, прыстасаванства, страты маральнага аблічча, пошукаў сэнсу існавання і г. д. Менавіта сэнс становіцца асноўнай катэгорыяй, якая звязвае ўсе наратывы кнігі. Прычым ён таксама закранае розныя сферы чалавечай экзістэнцыі: сэнс падзей, успамінаў, мінулага і будучыні, сэнс працы, сям'і і іншых сацыяльных інстытутаў, сэнс выбару, сэнс страты і, нарэшце, сэнс самога існавання.

Паводле гістарычных падзей, апісаных у кнізе, пасля распаду Савецкага Саюза тысячы людзей, адданых камуністычнай дактрыне, разам з радзімай страцілі і сэнс жыцця. Людзі аказаліся непрыстасаванымі да іншых умоў, праблемай стала «новае»жыццё і настальгія па мінулым. Многія не вытрымлівалі цяжару згубленых сэнсаў. Адсюль вынікала праблема суіцыду. Як піша Святлана Алексіевіч ва ўступным артыкуле да кнігі, «я шукала тых, хто намёртва прырос да ідэі, увабраў яе ў сябе так, што не ададраць, дзяржава стала для іх космасам, замяніла ім усё, нават уласнае жыццё. Яны не змаглі сысці з вялікай гісторыі, развітацца з ёй, быць шчаслівымі ў іншым. Занурыцца… знікнуць у прыватным існаванні, як гэта адбываецца сёння, калі маленькае стала вялікім» [2, с. 6].

Дзяржава і чалавек узаемна залежалі адно ад аднаго. Са стратай першага знікла і другое. Старэйшыя пакаленні, выхаваныя на ідэях сацыялізму, не змаглі знайсці сэнс у прыватным жыцці. Як сказаў вядомы французскі сацыёлаг, культуролаг і філосаф Жан Бадрыйяр, «попыт на прадметы і паслугі заўсёды можа быць створаны штучна: у сістэмы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ёсць адпаведны вопыт. Але калі неабходнасць сэнсу, жаданне рэальнасці аднойчы знікне, аднавіць яго ўжо немагчыма. Для сістэмы гэта катастрофа» [3, с. 10]. Аказваецца, гэта катастрофа не толькі для сістэмы, але і для асобнага чалавека, жыццём якога кіравала гэтая сістэма: «Няма клопату больш безупыннага і пакутлівага для чалавека, як, застаўшыся свабодным, адшукаць хутчэй таго, каму пакланіцца… і каму б перадаць хутчэй той дар свабоды, з якім гэтая няшчасная істота нараджаецца…» [2, с. 11].

У кнізе ў адмысловым парадку прадстаўлены гісторыі людзей, якія апынуліся па розныя бакі рэальнасці. Адны сціпла распавядаюць пра сваё жыццё, другія не стрымліваюць эмоцый. Але ўсіх гэтых людзей яднае тое, што праблема краху сацыялізму нікога не пакідае абыякавым да сённяшняга дня. Спадчына Савецкага Саюза стала цяжарам для гэтых людзей. Як прыклад, у кнізе адлюстравана гісторыя маршала Ахрамеева, якую мы бачым вачыма розных сведкаў тых падзей. Для абгрунтавання рэальнасці гісторыі Святлана Алексіевіч звяртаецца да архіўных матэрыялаў, заключэнняў следства, дзённікаў і запісак самога маршала: «Не магу жыць, калі гіне мая Айчына і знішчаецца ўсё, што я лічыў сэнсам у маім жыцці. Узрост і мінулае маё жыццё даюць мне права сысці з жыцця. Я змагаўся да канца» [2, с. 88]. Людзі бачылі адзінае выйсце ў самагубстве. Тут жа дарэчна будзе ўспомніць і масавыя істэрыі пасля смерці Сталіна, і культурны шок масаў пасля ХХ з’езду КПСС. У пэўным сэнсе савецкі чалавек усведамляў сябе праз адносіны да сістэмы. Ж. Бадрыйяр адзначаў: «Маўчанне мас, бязмоўе маўклівай большасці – вось адзіная сапраўдная праблема сучаснасці» [3, с. 8]. З маўклівай згоды пасіўнай часткі насельніцтва вырашаўся лёс народа, лёс асобнага чалавека.

Некаторыя яшчэ спрабавалі шукаць іншыя сэнсы для існавання. Людзі знаходзіліся ў адным кроку ад суіцыду. Бывала, што спыняла толькі фізічная неэстэтычнасць смерці: «Што спыніла мяне? Да канца я не дайшла… не… Як лекар, я ўсё ўяўляла… з усімі падрабязнасцямі… Смерць пачварная, яна не бывае прыгожай… Адна гэтая думка для жанчыны жахлівая. Ніякіх ілюзій аб прыгожай смерці ў мяне не магло быць» [2, с. 79].

Віктар Франкл у сваёй кнізе «Псіхолаг у канцлагеры»апісваў падобныя сітуацыі, у якіх людзі, знаходзячыся на мяжы жыцця і смерці, шукалі нейкі сэнс для таго, каб жыць далей. Да прыкладу, такім сэнсам для самога Віктара Франкла была яго жонка: «…у самай цяжкай з усіх, якія толькі можна ўявіць, цяжкіх сітуацый, калі ўжо немагчыма выразіць сябе ні ў якім дзеянні, калі застаюцца толькі пакуты, – у такой сітуацыі чалавек можа сцвердзіць сябе праз узнаўленне і сузіранне вобраза таго, каго ён кахае. Упершыню ў жыцці я змог зразумець, што маюць на ўвазе, калі гавораць, што анёлы шчаслівыя любоўным сузіраннем бясконцага Бога» [4, с. 23].

Многія былыя атэісты менавіта так і прыходзілі да рэлігіі. Калі раней партыя забараняла веру ў Бога, то цяпер, за адсутнасцю самой забароны, за адсутнасцю партыі людзі шукалі выйсце ў рэлігіі: «Зноў людзі сталі ў Бога верыць, бо няма іншай надзеі. А калісьці мы ў школе вучылі, што Ленін – Бог, і Карл Маркс – Бог…» [2, с. 61].

Савецкі чалавек не хацеў змяняцца. У многіх адсутнічала прыватная ініцыятыва. І калі сістэмы не стала, людзей ахапіла пачуццё разгубленасці. У другой сваёй кнізе «Чалавек у пошуках сэнсу»Віктар Франкл піша: «Менавіта там, дзе мы бездапаможныя і пазбаўленыя надзеі, калі мы не ў стане змяніць сітуацыю, – менавіта там мы адчуваем неабходнасць змяніцца самім»[5, с. 16]. Трагедыя постсавецкага часу заключалася ў тым, што пазбаўленыя сэнсу жыцця людзі не бачылі неабходнасці змяняцца: «Я любіў імперыю… Мне жыццё пасля імперыі сумнае. Нецікавае» [2, с. 27].

Кніга «Час сэканд-хэнд»пабудаваная такім чынам, што на фоне ўспамінаў аб пазітыўных зменах у грамадстве пасля 1991 года аповеды пра зламаныя, скалечаныя чалавечыя жыцці выглядаюць яшчэ больш трагічнымі. Немалаважную ролю ў гэтым адыгрывае прыхаваны «па-за кадрам»голас самой Святланы Алексіевіч, яе адносіны да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сітуацыі. На думку В. Крылова, «спрабуючы заняць пазіцыю «стрыманага гісторыка, а не гісторыка з запаленым факелам», С. Алексіевіч выяўляе сваю волю ва ўсёй канструкцыі кнігі – і ў знешняй архітэктоніцы, і ва ўнутраных кампазіцыйных су/супрацьпастаўленнях» [1, с. 252]. Дзякуючы своеасабліваму мантажу агульнай карціны, якую мы бачым не вачыма апавядальнікаў, а так, як яе бачыць аўтар, атрымліваецца не проста споведзь розных персанажаў, а цэлы гістарычны кантэкст пэўнага часу з характэрнымі для яго пытаннямі.

Акрэсленая праблема страты сэнсу існавання можа вызначацца як культурная траўма. Гэты тэрмін увёў ў сацыялогію польскі вучоны Пётр Штомпка: «У святле тэорыі сацыяльнага станаўлення пад гэтым трэба разумець складаны, штучны від чалавечай калектыўнасці, які дазваляе яе творчую саматрансфармацыю», «нас асабліва будуць цікавіць раздваенне, раскол, супярэчлівасць, канфлікт унутры культуры, якія ўзнікаюць хутка і нечакана і ахопліваюць ключавыя кампаненты культуры, – каштоўнасці, вераванні, нормы грамадства» [6, с. 3]. Усе гэтыя праблемы былі адлюстраваны Святланай Алексіевіч у апошняй кнізе серыі «Галасы ўтопіі». Свядомасць чалавека раздвойвалася паміж камуністычным мінулым і капіталістычнай будучыняй, адкідаючы ўбок наяўнасць сённяшняга дня: «Вера была шчырая… наіўная вера… Паверылі, што вось зараз… ужо стаяць на вуліцы аўтобусы, якія павязуць нас у дэмакратыю. Будзем жыць у прыгожых дамах, а не ў шэрых «хрушчоўках», пабудуем аўтабаны замест раздзяўбаных дарог, станем усе добрымі. Рацыянальных доказаў гэтаму ніхто не шукаў. Іх і не было. А навошта? Верылі сэрцам, а не розумам» [2, с. 47].

Паводле П. Штомпкі, «сучасным прыкладам траўмы на макра-ўзроўні служыць крах камунізма і трансфармацыі ўсходнееўрапейскіх грамадстваў. Падзея, якая была сустрэта з энтузіязмам большасцю людзей, аказалася, прынамсі, на нейкі час і для некаторых груп прычынай траўматычных перажыванняў, вядомых як «боль пераходу»(беспрацоўе, статусная дэградацыя, галеча, рост злачынстваў)» [6, с. 4]. У кнізе «Час сэканд-хэнд»можна знайсці шмат прыкладаў гэтаму.

Культурная траўма можа праяўляцца на розных узроўнях: біялагічным, дэмаграфічным, інтэлектуальным, сацыяльным і г. д. Адным з відавочных наступстваў траўматычнага перыяду пераходу да дэмакратычнага ладу жыцця стаў рост самагубстваў. Менш відавочным быў спад нараджальнасці ў пачатку 1990-х гадоў – так званы «дэмаграфічны правал»: «Як жыць? Як выйсці на вуліцу? Вось проста выйсці на вуліцу і каго-небудзь сустрэць. Я тады… Ужо некалькі гадоў я жыла адна. Дачка выйшла замуж за афіцэра, з’ехала ва Уладзівасток, муж памёр ад раку. Увечары вярталася ў пустую кватэру. Я не слабы чалавек… Але думкі ўсякія… страшныя… яны з’яўляліся… Шчыра скажу… Былі, так…» [2, с. 53].

Як піша П. Штомпка, «траўма там, дзе несупадзенні, напружанні і сутыкненні ўспрыняты і перажываюцца як праблема, тое, што непакоіць, баліць і патрабуе лекавання. Тады культурная траўма праяўляецца ў інтэлектуальнай, маральнай і мастацкай мабілізацыі грамадства» [6, с. 8]. Ніхто не збіраўся лекаваць гэтую траўму грамадства. Напружанне не знікала, і яго наступствы ў інтэлектуальнай і маральнай сферы асабліва заўважныя сёння.

Тэорыя траўмы ў сваёй аснове мае два тыпы. Першы тып – стан рэчаў да траўмы ўспрымаецца як прадмет гонару, маральная аснова базавых каштоўнасцяў, прыклад для пераймання. Другі тып характарызуецца памяццю пра калектыўныя правіны таго грамадства, да якога належыць індывід, шырокім распаўсюджаннем пачуццяў сораму і віны за падзеі мінулага [6, с. 7]. Абодва гэтыя тыпы адлюстраваны Святланай Алексіевіч, і яны не могуць не ўражваць: «Тыя, хто называў сябе камуністамі, раптам сталі прызнавацца, што яны ненавідзелі камунізм з дзяцінства. Здавалі свае партбілеты… Адны прыносілі і пакідалі партбілеты моўчкі, іншыя ляскалі дзвярыма. Пакідалі ноччу да будынка райкама… Як злодзеі», «знаходзіліся і такія, хто

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хаваў свае чырвоныя кніжачкі, пакідаў на ўсялякі выпадак. Нядаўна ў адной сям’і мне дасталі з антрэсоляў бюст Леніна. Захоўваюць… раптам яшчэ спатрэбіцца…» [2, с. 50].

Людзі страчвалі мінулае: хтосьці свядома адмаўляўся ад яго і марыў пра будучыню, хтосьці адчайна чапляўся за ўспаміны, але шукаць сэнс для таго, каб жыць сённяшнім днём, наважваліся адзінкі. Нечаканая свабода стала непасільным цяжарам для мільёнаў савецкіх людзей, якія прывыклі жыць па загадах партыі і прынцыпах савецкай ідэалогіі.

Такім чынам, кніга С. Алексіевіч – далейшы глыбокі крок у напрамку вывучэння псіхалогіі савецкага чалавека.

**Літаратура**


1 Крылов, В. Н. Документ должен жить по законам искусства (История «домашнего» социализма в книге Светланы Алексиевич «Время секонд-хэнд») / В. Н. Крылов // Филология и культура. Philology and culture. – 2014. – № (37). – С. 250–253.

2 Алексіевіч, С. А. Час сэканд-хэнд (Канец чырвонага чалавека) / С. А. Алексіевіч; пер. В. Стралко, Ц. Чарнякевіч. – Мінск: Логвінаў, 2013. – 384 с.

3 Бодрийар, Ж. В тени молчаливого большинства, или Конец социального / Ж. Бодрийар, пер. Н. В. Суслов. – Екатеринбург: Издательство Уральского университета, 2000. – 32 с.

4 Франкл, В. Психолог в концлагере (Сказать жизни «Да!») [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.koob.ru. – Дата доступа: 15.04.2015.

5 Франкл, В. Человек в поисках смысла / В. Франкл. – М.: Прогресс, 1990. – 196 с.

6 Штомпка, П. Социальное изменение как травма (статья первая) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.isras.ru/files/File/Socis_/01-2001/Shtompka.pdf. – Дата доступа: 15.04.2015.



**УДК 37.017:39:316.647.5:37.018.552**



***А. В. Бегун***


## ВОСПИТАНИЕ ЭТНИЧЕСКОЙ ТОЛЕРАНТНОСТИ В ПОЛИКУЛЬТУРНОЙ ШКОЛЕ


*Данная статья рассматривает проблемы, с которыми сталкивается современная система образования, указывает направления работы педагогов в школе по формированию этнической толерантности, раскрывает группы противоречий, которые необходимо осмыслить для успешной жизнедеятельности школы. Статья указывает на необходимость создания единой программы по формированию толерантности, дает некоторые рекомендации.*


Задачей современной школы является качественное образование на основе сохранения его фундаментальности и соответствия актуальным и перспективным потребностям личности. На данном этапе актуальной проблемой является проблема воспитания толерантности.

Рост миграции вызвал необходимость создания в Республике Беларусь системы помощи вынужденным мигрантам. Эта система включает в себя «формирование толерантности по отношению к другим культурам, уважения к своему и другим этносам, положительного отношения к окружающим и доброжелательного отношения к миру в



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ